**УДК 342**

# КЛАСІФІКАЦЫЯ ПАВЯТОВЫХ СОЙМІКАЎ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў ПЕРЫЯД 16–18 стст.

***Л.Д. АНІСЬКОВІЧ***
**(*Прадстаўлена: ст. выкл. А.В. ВАЛЕЎКА*)**

*Мясцовае самакіраванне як палітычны феномен у разрэзе гістарычнага перыяда 16–18стст. – істотная, патрабуючая ўвагі тэма. У артыкуле разглядаееццa інстытут павятовых соймікаў як непасрэдная форма тагачаснага мясцовага самакіравання, у прыватнасці – праблематыка класіфікавання соймікаў.*

Мясцовае самкіраванне – гэта палітычны інстытут, які накіраваны на тое, каб даць магчымасць насельніцтву самастойна вырашаць свае праблемы лакальнага ўзроўню без ўплыву на гэта дзяржаўнай улады. Аднак, калі мы звяртаемся да перыяду 16–18 стагоддзяў, то неабходна адзначыць спецыфіку мясцовага самакіравання гэтага прамежку часу, бо органы такога інстытута выражалі інтарэсы не ўсяго насельніцтва, а толькі пануючага саслоўя перыяду ВКЛ – шляхецкага. З гэтай нагоды навукоўцы, якія займаюцца такога роду пытаннем, называюць тагачасныя органы мясцовага самакіравання органамі, так званай, “шляхецкай дэмакратыіі”.

Адной з формаў мясцовага самакіравання ў ВКЛ былі соймікі. Соймік (сеймік) у ВКЛ у 16–18 стст. – сход шляхты павета, дзейнасць якога рэгламентавалася нормамі права; форма самарэалізацыі шляхецкай супольнасці павета і дзяржаўна-прававы інстытут, дзякуючы якому шляхецкая супольнасць была здольная прымаць рашэнні. [1, с. 615].

Дзейнасць іх была дастаткова рэгламентаванай. Існаваў цэлы шэраг заканадаўчых актаў, прававыя нормы каторых замацоўвалі розныя аспекты соймікавай дзейнасці: перш за ўсё, гэта Статуты ВКЛ 1566 і 1588 гг., сюды ж мы адносім і Віленскі прывілей 1565 г., Соймавую пастанову 1567 г., і нават Канстытуцыю 1791 г. Аднак, вучоныя адзначаюць, што жыццёвая практыка і заканадаўчыя прадпісанні супадалі не заўсёды. Так, Т. Доўнар сцвярджае, што “… не ўсе статуныя нормы, якія рэгламентавалі дзейнасць сойма і павятовых соймікаў, выконваліся на практыцы. Жыццё значна папраўляла заканадаўства і часта не ў лепшы бок”. [2, с. 24].

Многія даследчыкі займаліся апісаннем і класіфікацыяй соймікаў, грунтуючыся на іх паўнамоцтвах, кампетэнцыі, назвах і г.д. Зыходзячы з гэтага, нескладана ўсвядоміць тое, што цяжка выпрацаваць адзіныя чыннікі класіфікацыі соймікаў. Так, становіцца зразумелым, што першыя праблемы адносна соймікаў узнікаюць нават на тэарытычным узроўні, аднак на падставе існуючых даследванняў магчыма выявіць некаторыя агульныя рысы. Такім чынам, мы можам вылучыць наступныя віды соймікаў: перадсоймавыя, генеральныя, элекцыйныя, рэляцыйныя, якія можна назваць асноўнымі, да іншых жа мы адносім дэпутацкія (трыбунальскія, грамнічныя), гаспадарчыя, фіскальныя.

I. Перадсоймавыя

• перадсоймавыя соймікі, утвораныя паводле кароннага ўзору ў адпаведнасці з бельскім прывілеем і юрыдычна санкцыянаваныя Статутам 1566 г., увайшлі пасля Люблінскай уніі ў парламенцкую сістэму Рэчы Паспалітай у нязменным выглядзе. Аднак іх паменела, бо землі Падляшша, Валыні і Кіеўшчыны былі ўключаныя ў Карону; [3, с. 77]

• падставаю з’езда шляхты на передсоймавы соймік быў каралеўскі ўніверсал, але часта соймік здараўся і без яго, калі ролю ініцыятара браў на сябе нехта са службоўцаў, хто чуўся ўпаўнаважаным да гэтага, згодна с рашэннем шляхецкай грамады (часта папярэдняга сойміка). [3, с. 84] Акрамя ўніверсалаў, кароль высылаў лісты – “адкрытыя” і “закрытыя” – да магнатаў і шляхцічаў з заахвочваннем узяць удзел у сойміку і падтрымаць выкладзеныя ім у інструкцыі прапановы, абраць годных паслоў. [3, с. 86–87] Апрача караля, чыё права склікаць соймікі было неаспрэчным, існавала багата інстытутаў, якія валодалі такімі правамоцтвамі. Гэта былі ваяводы і кашталяны, сенатары, павятовыя і канфедэрацыйныя маршалкі, судовыя старасты, падкаморыі, харужыя, павятовыя і генеральныя палкоўнікі, іншыя соймікі або з’езды, соймы; [3, с. 87–88].

• тэрмін: скліканне перадсоймавых соймікаў павінна было адбыцца за 6 тыдняў перад вальным соймам. А таксама, згодна з заканадаўствам соймік не мог працягвацца даўжэй за 4 дні; [3, с. 82].

• мэта збірання (функцыі): абранне паслоў, перадача ім даручэнняў адносна дзеянняў на сойме і нарэшце рэдактура ўхвалы па пытаннях, узнятых на сойміку і прынятых сабранымі. [3, с. 135].

II. Генеральныя

• генеральныя соймікі, якія называліся таксама правінцыйнымі соймікамі, галоўнымі соймікамі і нават соймамі, былі вядомыя Кароне ўжо з 20-х г. 15 ст. Генеральны соймік (генерал) Вялікага Княства Літоўскага быў уведзены на ўзор каронных – хоць мы не ведаем, ці паводле жадання саміх ліцвінаў – сілай г.зв. генрыхаўскіх артыкулаў; [3, с. 167].

• тэрмін: гаворкі пра дакладны тэрмін не было, а толькі пра тое, што ён павінны збірацца перад каронным вальным соймам. А вось ужо у трэцім Статуце ВКЛ 1588 г. згадвалася, што соймік або галоўны з'езд меўся збірацца за 2 тыдні да кожнага вальнага сойму; [3, с. 169].

• парадак правядзення паседжанняў (кампетэнцыя): паседжанні адбываліся ў двух палатах (колах) – сенатарскай і пасольскай. Маршалка пасольскай ізбы абіралі адразу ў першы дзень, наколькі гэта было магчыма. Пасля выбару маршалка знаёміліся (у сенаце) з прапановаю (інструкцыяй), прывезенай каралеўскім паслом. Пасля афіцыйнай падзякі паслу за выкананне місіі знаёміліся з іншымі лістамі, накіраванымі з'езду ад службовых асобаў, інстытутаў, грамадаў і прыватных асобаў. Пасля прачытання лістоў пачыналі галасаванне, ад найвышэйшага паводле рангу сенатара і аж да паслоў, згодна з ерархіяй значнасці паветаў. Часавага абмежавання на падачу галасоў не было. Пасля іх заканчэння вылучалі камісію дзеля складання супольнай інструкцыі для ўсяго Вялікага Княства. Нарэшце даваўся адказ на дасланыя дакументы і накіроўваліся лісты да розных асобаў пра дзяржаўныя справы. Афіцыйныя акты сойміка падпісвалі сенатары, маршалак (дырэктар) пасольскага кола і некаторыя паслы. [3, с. 172–174].

III. Элекцыйныя

• функцыі: на элекцыйных сойміках шляхта выбірала электаў (кандыдатаў) на пасады суддзі, падсудка і пісара земскага павятовага суда (з 1564–66), падкаморыя, харужага (1588) і некаторыя іншыя ўрады. У 17 ст. шляхта атрымала права прадстаўляць манарху электаў і на вышэйшую пасаду ў павеце – павятовага маршалка. Таксама на элекцыйных сойміках шляхта выбірала павятовых возных (з 1565), якіх зацвярджаў ваявода і возных-генералаў (з 1588), якіх прызначаў на ўрад вялікі князь. У асобных землях ВКЛ на сойміках выбіралі і сенатараў – ваявод полацкага і віцебскага, старасту жамойцкага; [1, с. 616–617].

• прадугледжвалася авансаванне (прасоўванне) на элекцыйных сойміках земскага пісара або падсудка па пасаду суддзі і земскага пісара на падсудства. [1, с. 616].

IV. Рэляцыйныя

• рэляцыйныя соймікі ўтварыліся паводле Статута 1588 г.; [3, с. 213].

• тэрмін: у 1588 г. было пастаноўлена, што такія соймікі маюць збірацца ў кожным павеце праз чатыры тыдні ад заканчэння сойму. На практыцы ж гэта бывала па-рознаму. Найчасцей, аднак, соймікі склікаліся ў інтэрвале ад 2 да 8 тыдняў пасля сойму, або зазначалася, што яны адбудуцца, калі прыдуць неабходныя для іхняй працы дакументы – галоўным чынам канстытуцыі; [3, с. 213–214].

• мэта збірання (функцыі): іх мэтаю было інфармаванне шляхты пасля вяртання з сойму пра ход паседжанняў і прынятыя ўхвалы. [3, с. 213]. Але рэляцыйны соймік не абмяжоўваўся толькі прыняццем справаздачы з соймавых падзеяў, але часам мусіў прымаць рашэнні пра выкананне соймавых ухвалаў. [3, с. 217] Шляхта пад кіраўніцтвам свайго дырэктара (маршалка) не толькі выслухоўвала пасольскія рэляцыі, але і ацэньвала іх дзейнасць на сойме; [3, с. 218].

• вышэйзгаданыя сферы дзейнасці рэляцыйных соймікаў не вычэрпвалі іхніх формаў актыўнасці, бо адсутнасць нормаў дазваляла сабранай шляхце разглядаць справы, прапанаваныя кім заўгодна. Яны маглі тычыцца як агульнадзяржаўных і рэгіянальных, так і прыватных пытанняў. [3, с. 219].

Калі гаварыць адносна астатніх соймікаў, то мэтаю дэпутацкіх – быў выбар дэпутатаў ў Галоўны Трыбунал, а іх паседжанні праводзіліся самастойна штогод 2 лютага; асноўнай задачай гаспадарчага – было размеркаванне падаткаў, а таксама попісавы з'езд з мэтай попісу войска; фіскальныя соймікі ішлі поруч з гаспадарчымі, бо іх мэтаю было ўсталяванне падатковых абцяжванняў і вызначэнне функцыянераў для іх збору ды пільнавання парадку пры выкананні звязаных з гэтым працэдураў. [3, с. 227–232].

Такім чынам, мы бачым, што распрацаваць адзіныя чыннікі класіфікацыі соймікаў у нас не зусім што атрымалася, аднак альтэрнатываю гэтаму выступае тое, што на падставе аналізу існуючых даследванняў мы вылучылі наступную групу павятовых соймікаў: перадсоймавыя, генеральныя, элекцыйныя, рэляцыйныя, дэпутацкія (трыбунальскія, грамнічныя), гаспадарчыя, фіскальныя, і грунтуючыся на кампетэнцыі соймікаў умоўна можам падзяліць іх на першасныя: перадсоймавыя, генеральныя, элекцыйныя, рэляцыйныя, і на другасныя: дэпутацкія, гаспадарчыя і фіскальныя.

## ЛІТАРАТУРА

1. Радаман, А. Соймік // Вялікае Княства Літоўскае : энцыклапедыя : у 2 т. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2007. – Т. 2. – С. 615–618.
2. Доўнар, Т. Вытокі і гістарычнае развіццё інстытута парламентарызму ў Беларусі / Т. Доўнар // Парламенцкія структуры ўлады ў сістэме дзяржаўнага кіравання Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай у XVI – XVIII стагоддзях : матэрыялы міжнар. навук. канф., Мінск – Наваградак, 23–24 ліст. 2007 г. / навук. рэд. С.Ф. Сокал, А.М. Янушкевіч. – Мінск : БІП-С Плюс, 2008. – 374 с.
3. Рахуба, А. Вялікае Княства Літоўскае ў парламенцкай сістэме Рэчы Паспалітай 1569–1763 гг. / Анжэй Рахуба ; пер. з пол. мовы М. Раманоўскі ; навук. рэд. Г. Сагановіч. – Медысонт, 2008. – 424 с.